**Выніковы тэст па раздзеле**
**“Складаназлучаныя сказы”**
**9 клас**

1. **Адзначце складаназлучаныя сказы**

а) Школа была не вельмі далёка, і шукаць яе прыйшлося нядоўга
б) Дзе пройдуць ногі маладосці, дыхне жыццём і мёртвая зямля
в) Сонца было яшчэ высока, ды ўжо не грэла
г) Толькі зрэдку прашуміць крыламі птушка, ды жаласна заскрыпіць ствол пад напорам лютага ветру
д) Прыпякала сонца, ды веяў лёгкі ветрык

2. **Адзначце сказы са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі**

а) Зямля – наша багацце, і яе трэба берагчы
б) Без працы я не быў нідзе, а праца нам і творыць долю
в) Міканор гаварыў горача, пераканана, але слухалі яго большасць юдзейцы недаверліва, ці нават непрыхільна
г) Вецер патроху цішэў, і завеяў полі спакайнела
д) Гладкая, як шкло, вада стаіць нерухома, і ў ёй адбіваюцца і цёмна-блакітнае неба, і воблакі, і першыя зоркі

3. **Адзначце сказы з супраціўнымі сэнсавымі адносінамі**

а) К ночы вецер сціхаў, затое з шумлівай цемрадзі пачаў накрапваць дождж
б) Было ўжо за поўнач, але паветра нетолькі не халадзела, а, здавалася, нават цяплела
в) Града камення загараджвала шлях вадзе, і разгневаны паток дыбіўся на каменні, прасочваўся паміж імі дзясяткамі ручаёў
г) Снапы ляжалі роўнымі радамі ўжо да палавіны страхі, а яшчэ не ўсё было везена
д) У Петрушах сваёй чаргоюжыццё штодзённае плыло, і лета следам завясною свой клопат несла ў сяло

4. **Адзначце сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку**

а) У цішыні часта і звонка падалі кроплі бярозавікуў бляшаны бачок, ды ледзь чутна шапацела голле
б) Над шырокай зямлёй пахне восенню і яснымі днямі дзьме густы вецер
в) Скончыўшы работу, Андрэй акінуў вокам гэты куток, і на твары яго з’явілася ўсмешка здавальнення
г) Работу кончыў серп у полі, і лета хіліцца на спад, і плод у сонцавым падоле за агароджай спеліць сад

5. **Адзначце сказы,у якіх на месцы пропуску ставіцца коска**

а) У мора апускаўся шар чырвоны _ і хвалі закіпалі і раўлі, ды раптам побач, ледзь вышэй балкона, на поўдзень праляцелі жураўлі
б) Плывуць дні, ночы ў хвалях часу _ і восень сунецца пад тын.
в) Ці перад продкамі мне трымаць адказ за кожны крок і сказ не надта гладкі _ ці з думаю адзінаю пра вас на свеце жыць, далёкія нашчадкі?
г) Пад напорам буры рыпелі кроквы _ глуха стагналі сцены

**6. Колькі і якіх знакаў прыпынку павінна быць у сказе? Адзначце нумар правільнага адказу**

*А бусел у нас яшчэ кажуць бацян адзін са сваёй буслiхай і мы іх віталі можна сказаць персанальна*

а) 5 косак
б) 3 коскі
в) 2 працяжнікі, 3 коскі
г) 2 працяжнікі, 1 коска

7. **Колькі і якіх знакаў прыпынку павінна быць у сказе? Адзначце нумар правільнага адказу**

*З другога боку прасекі лес быў высечаны колы год назад і цяпер уся доўгая лесасека зарасла непралазным гушчаром бярэзнікам асіннікам арэшнікам*

а) 4 коскі

б) 1 двукроп'е, 3 коскі

в) 1 працяжнік, 3 коскі

г) 3 коска

**8. Адзначце сказы, якія адпавядаюць наступнай характарыстыцы:**

*Складаназлучаны сказ,складаецца з дзвюх граматычных частак, паміж часткамі выражаюцца далучальныя адносіны*

а) Аб'езд быў далёка, і таму рашылі паспрабаваць прайсці праз мост

б) Ідзе дзень, а разам з ім і дуць ілюдзі – ці мала каму што тут трэба зрабіць?

в) Памалу гутарку мы распачалі, а шмат аб чым пагутарыць было

г) Насця звычайна выходзіла на спатканне яму, цяпер жа яе тут не відаць было

**9. Адзначце "трэці лішні" сказ (знакі прыпынку не расстаўлены)**

а) Мінула восень а за ею прыйшла з марозамі зіма

б) Хвалі падмываюць высокі бераг і ён паступова абвальваецца ў возера

в) Хлопцы выцягнулі лодку на бераг і, каб не змыла вадой, прывязалі да дрэва

**10. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска**

а) Хвалямі набягаў вецер _ і тады сыпалася з дрэў лістота

б) Беглі дні_ і памалу канчалася восень

в) Вялікія белыя хмары плалі адна за другою _ і часам закрывалі сонца

г) Жураўлі праляталі над полем, забіраючы лета з сабой _ ды пагульваў вецер на волі з неакрэсленай ціхай журбой